ТБШ
318746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

*Аўтары:*
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**8 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 166[illegible].
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.200[illegible].
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-[illegible]8.
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

## ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са зваротkамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Аўтары выказваюць шчырую падзяку кандыдату педагагічных навук дацэнту кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І. М. Саматыі і настаўніцы беларускай мовы і літаратуры СШ № 2 г. Маладзечна Г. Ф. Гусевай-Шкадун за карысныя заўвагі і парады, якія садзейнічалі паляпшэнню вучэбнага дапаможніка.*

*Аўтарскі калектыў з удзячнасцю прыме ўсе заўвагі і пажаданні, накіраваныя на паляпшэнне гэтага выдання. Свае прапановы можна дасылаць па наступных адрасах: 220050, г.Мінск, вул. Савецкая, 18, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, кафедра беларускага мовазнаўства або 220123, г. Мінск, абаненская скрынка нумар 135.*

# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

#### Надыход вясны

Вецер **зайшоў у Вострава**. Ён падзьмуў па палудні з-за ракі на Выганчык, гонячы мокрыя і калючыя **сасновыя іголкі** і тонкую, як папера, жоўтую кару. Яна **бліпчала на зямлі**, мокнучы на снезе, і **чарнела ўгары** над галавой.

Запахла лесам, свежым дрэвам і **мокрым снегам**. **Пах лесу** ў Мсціжы пачынала прыносіць заўсёды на згоне зімы, калі ў доўгія адлігі адтавалі сосны і чарсцвелі, высыхаючы на калючым, **суровым ветры**, ад якога трэскаюцца рукі і сіверае твар.

Мсціжы — вёска на беразе Жоглаўкі. Вёску **абышлі з трох бакоў** балоты па звіле ракі. На поўначы за Мсціжамі пачыналася доўгае пагор'е, якое падыходзіла аж пад самую Вілію і Курачовы Цяні. Пагор'е было шырокае, роўнае, парослае маладняком і рэдкімі, абгарэлымі знізу соснамі. Яны, нацягнутыя смалой, да таго цвёрдыя, што **не даткнуцца тапаром**. Параслі яны, не зачэпленыя падсочкай за свой век, аж у самае неба, папрысядалі ў камлях ад цяжару, каб **апірацца цвярдзей** на старасці. (146 слоў)

*Паводле І. Пташнікава*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**ЗАДАННІ**

1. У выдзеленых словазлучэннях вызначыць віды падпарадкавальнай сувязі слоў. Назваць, якія ў іх выражаюцца сэнсава-граматычныя адносіны.
2. Растлумачыць ужыванне вялікай літары ў тэксце.
3. Падкрэсліць у тэксце дзеепрыметныя і дзеепрыслоўныя звароты. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

## КАМЕНЦІРАВАНЫ ДЫКТАНТ

### Закінуты горад

**Маўглі яшчэ ніколі не бачыў індыйскага горада.** Гэты горад ляжаў увесь у руінах, ён здаўся хлопчыку пышным і поўным цудаў. Яшчэ відаць былі рэшткі брукаваных дарог, што вялі да разбураных варотаў, дзе апошнія абломкі дошак віселі на заржавелых завесах. Дрэвы ўраслі каранямі ў сцены і ўзвышаліся над імі. **Зубцы на сценах абваліліся і рассыпаліся ў пыл.** Паўзучыя расліны выбіліся з байніц і звісалі са сценаў вежаў, быццам касматыя бізуны.

**Вялікі палац без даху стаяў на вяршыні ўзгорка. Мармур яго фантанаў і двароў быў увесь пакрыты расколінамі і бурымі плямамі лішайнікаў.** Самі пліты двара, дзе калісьці стаялі князевы сланы, былі прыўзняты і рассунуты травой і маладымі дрэвамі. За палацам былі відаць рад за радам дамы без стрэх і ўвесь горад, падобны на пустыя соты, запоўненыя толькі цемрай. (126 слоў)

*Паводле Р. Кіплінга*

**ЗАДАННЕ**

Выпісаць з выдзеленых сказаў словазлучэнні з сінтаксічнай сувяззю кіравання і прымыкання і разабраць іх.



## ТВОРЧЫ ДЫКТАНТ

◇◇◇

Робін Гуд сеў на каня і паехаў. Ён добра ўзброіўся ў дарогу. На ім былі кальчуга і сталёвы шлем, на баку добры меч, на руцэ невялікі круглы шчыт, на поясе калчан са стрэламі, а на плячы вялікі лук.

Нарэшце Робін Гуд апынуўся ў прыгожай даліне, дзе стаяў Манастыр ля Крыніц. Яго руіны яшчэ і сёння ляжаць там. Між берагоў бруілася рака — сярэбраная стужка на зялёным дыване раўніны. Робін Гуд прытрымаў каня: хацеў акінуць вокам краявід, і раптам заўважыў чалавека, які ішоў берагам рэчкі. Хоць чалавек быў у плашчы манаха-дабрака, падпяразаным вяроўкай, на галаве ў яго быў сталёвы шлем, а на баку меч і круглы шчыт. Адразу ўзнікла думка: што робіць тут гэты манах-воін? (113 слоў)

*Паводле Дж. Ф. Купера*

**ЗАДАННІ**

1. Прыдумаць і запісаць заканчэнне тэксту, выкарыстоўваючы розныя тыпы словазлучэнняў.
2. Даць загаловак тэксту.
3. Знайсці і падкрэсліць словазлучэнні з сінтаксічнай сувяззю дапасавання ў запісаных сказах.

## ВОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Восень

Яшчэ не паспее апусцець зямля, асыпацца ліст на дрэве, яшчэ ярка грэе сонца, а ўжо не чутно галасоў птушак, і саміх іх мала відаць.

Ужо са жніўня месяца пачынаюць птушкі пакідаць наш край і вылятаюць у цёплую краіну. Першыя падымаюць трывогу буслы. Незадоўга да адлёту збіраюцца яны ў кучы дзе-небудзь на лузе, ходзяць цэлы дзень чародамі або стаяць па цэлых



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гадзінах, усё роўна як радзяцца яны перад далёкай дарогай ці кружацца высока ў небе. Праз некалькі дзён яны прападаюць, выбіраюцца ў вырай.

Нахмурылася неба, веюць халодныя вятры, сыплецца дробны дожджык. Вясёлыя спрытныя ластаўкі лётаюць над зямлёю і ловяць мошак. Гадзіны праходзяць, на двары халадзее, прападаюць мошкі. Няма чаго есці ластавачкам. Вось і яны выбіраюцца ў дарогу. У палавіне верасня іх ужо не ўгледзіш. Ранні адлёт ластавак азначае ранднюю зіму. (130 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме.
2. Знайсці і падкрэсліць словазлучэнні з сінтаксічнай сувяззю кіравання. Абазначыць галоўнае слова ў гэтых словазлучэннях. Якімі часцінамі мовы выражаны галоўныя кампаненты?
3. Знайсці ў тэксце сказы, якія адпавядаюць схеме: ▭, ▭, ▭. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Цішыня

Узвёў позірк угору, убачыў бясшумнае дубовае лісце, а праз яго — блакітныя бяздонныя яміны неба. Усюды была цішыня. Хоць бы хто крыкнуў, грукнуў, хоць бы рыпеў голлем дуб і рэзаў шчаку вецер. Была цішыня, а значыць, вяшчун казаў праўду. Княжыч абыякава, ужо не са злосцю, паглядзеў на яго і пайшоў ад святога дуба. Адпусціўшы халопа Найдзёна ў Навагародак, сеў на каня, павольна паехаў, а куды — сам не ведаў. У нейкую асінавую гушчэчу, у змрок ельнікаў, дзе ўсё заткана бледна-зялёнай заечай капустай. Там ляжалі агромністыя спарахнелыя дрэвы. Некаторыя, паваленыя калісьці бурай, віселі на плячах у сваіх суседзяў, не змогшы ўпасці на зямлю. Не адзін сонцаварот, згінаючыся, крэкчучы ад напругі, стаяць дрэвы. Конь, палахліва сапучы, правёз Далібора пад імі, прашыўся праз гусцеж нізкарослых бярозак, убіўся ў прыбалатак, падышоў да балота. Княжыч, як сонны, злез з каня, стаўшы ў цёмна-рудую халаднаватую ваду. І зноў наўкола ўсё замерла ў спякоце. Навокал была цішыня. (148 слоў)

*Паводле Л. Дайнекі*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць яго па памяці.
2. Знайсці ў тэксце і падкрэсліць словазлучэнні з сінтаксічнай сувяззю кіравання.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Лясная музыка

Лес — жывая вопратка зямлі, яе музыка. Яго настрой мяняецца на працягу аднаго нават дня. Шмат пазней, у сталыя гады, мне прыйшлося бачыць мора — і паўночнае, і паўднёвае. Яно таксама на вачах мяняецца. Мора выклікае бурныя пачуцці: адвагу, прагу подзвігу, імкненне ў новыя далечы. Лес абуджае пачуцці інтымныя, глыбока схаваныя. Па багацці фарбаў, гукаў, пераходаў лес багацей за мора, толькі яго музыка, светавая гама не такія кідкія.

Гаспадары асенняга лесу — дзяцел і бесклапотныя сініцы. Астатняе шэрае птаства, збіраючыся ў вырай, змаўкае. У ядлоўцавых зарасніках можна падняць соннага днём цецерука, і ён гучна заклапоча крыламі, вірuючы між соснаў, ніколі не падымаючыся над купамі дрэў. Цікавая вавёрка грыбнікоў не баіцца: спусціцца на ніжні сук, падзівіцца вокам-шрацінкай і шугане рыжай маланкай між зялёнай навісі. (120 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННЕ**

Знайсці ў тэксце і падкрэсліць дзеяслоўныя словазлучэнні. Праверыць сябе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВЫБАРАЧНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Красавіцкае сонца

Красавіцкае сонца свяціла на поўную сілу, і ўздоўж платоў, здавалася, прама на вачах, расла, падымалася зялёная аксамітная травіца. Перасвістваліся на высокіх ліпах шпакі. Нябачныя ў глыбіні нябеснай сілы, рассыпалі звонкае срэбра жаваранкі. Жоўтым дымам пахучых коцікаў ахуталіся вербы, і над імі пазвоньвалі празрыстымі крыльцамі сотні пчол, мушак, жучкоў, бясшумна снавалі белыя і жоўтыя матылькі.

Якімка спыніўся, загледзеўся на ўсё гэта хараство і на момант нават забыўся, што навокал грыміць вайна, гінуць людзі і вось такія прыгажуні вербы, ліпы, бярозкі... Дрэвы весела шапацелі лісцем, нібы размаўлялі з Якімкам, радасна сустракалі яго. Бярозкі ледзь трымцелі клейкімі лісточкамі пад веснавым сонцам. І здавалася, што няма большай прыгажосці ў свеце. (116 слоў)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце і выпісаць назоўнікавыя словазлучэнні.
2. Зрабіць сінтаксічны разбор выпісаных словазлучэнняў.
3. Вызначыць, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца залежныя словы ў названых словазлучэннях.

## КАНТРОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Бэзавы букет

Мне ішоў семнаццаты год. Мая семнаццатая вясна была вельмі багатай на кветкі, на цеплыню, на тыя цудоўныя дні, калі, здаецца, сама зямля спявае песню сонцу, жыццю, высокаму сіняму небу.

Даўно ўжо з усіх кветак я палюбіў бэз. Бэз расцвітаў якраз у час нашых школьных экзаменаў.



Букет ружова-сініх кветак заўсёды стаяў на стале, засланым чырвоным абрусам. За сталом сядзелі строгія экзаменатары, а на стале былі акуратна раскладзены білеты.

Падыходзячы да стала, я заўсёды хваляваўся. У такія хвіліны я, вядома, не звяртаў увагі на бэз, хоць стаяў ён у мяне пад самым носам. Затое пасля экзаменаў пах бэзу да самага вечара п'яніў галаву.

Ніколі яшчэ бэз не расцвітаў так, як сёлета. Ён сінеў цэлымі азяркамі па садах, палісадніках, у нашым станцыйным скверыку. І была такая прыгажосць навокал, што, здавалася, сама зямля апранула на сябе бела-ружовую вопратку. (134 словы)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННЕ**

1 в. — выпісаць з тэксту дзеяслоўныя словазлучэнні і зрабіць сінтаксічны разбор.
2 в. — выпісаць з тэксту назоўнікавыя словазлучэнні і зрабіць сінтаксічны разбор.

## ПЕРАКАЗЫ

### Памяці Элаізы Ажэшкі

Жыццё гэтай жанчыны ніколі не было спакойным. Як не было і не будзе спакойным жыццё Нёмана-ракі, якую яна любіла фанатычна. Яе рукі, яе душа ніколі не ведалі адпачынку. Яе няпростае жыццё не зрабіла яе жорсткай. Толькі мужнай і спагадлівай. Мужнай да трывання асабістых цяжкасцей. Спагадлівай да іншых людзей.

Творы Элаізы Ажэшкі прысвечаны беларускай зямлі і, найперш, Гродзеншчыне. Яна пісала: «У прыродзе і людзях гэтага кутка я знайшла многа рэчаў, пра якія мне хочацца пісаць. Цэлае лета правяла ў Панёмуні. Уважліва назірала прыроду і людзей вёскі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест

*Прадмова* ........ 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ ........ 7

Папераджальны дыктант ........ 7
Каменціраваны дыктант ........ 8
Творчы дыктант ........ 9
Вольны дыктант ........ 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 10
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 11
Выбарачныя дыктанты ........ 12
Кантрольны дыктант ........ 12

ПЕРАКАЗЫ ........ 13

ПЕРАКЛАДЫ ........ 20

Пераклад-пераказ ........ 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ ........ 33

Папераджальныя дыктанты ........ 33
Каменціраваныя дыктанты ........ 34
Тлумачальны дыктант ........ 36
Вольны дыктант ........ 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........ 37
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 39
Выбарачны дыктант ........ 40
Кантрольныя дыктанты ........ 40

ПЕРАКАЗЫ ........ 42

ПЕРАКЛАДЫ ........ 49

Пераклад-пераказ ........ 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 53

Папераджальны дыктант ........ 53
Каменціраваны дыктант ........ 54
Тлумачальны дыктант ........ 54
Творчыя дыктанты ........ 55
Вольныя дыктанты ........ 56
Выбарачныя дыктанты ........ 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 61
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 62
Кантрольныя дыктанты ........ 63

ПЕРАКАЗЫ ........ 66

ПЕРАКЛАДЫ ........ 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 91

Папераджальны дыктант ........ 91
Каменціраваныя дыктанты ........ 92
Тлумачальны дыктант ........ 93
Творчы дыктант ........ 94
Вольны дыктант ........ 94
Выбарачны дыктант ........ 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 96
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 97
Кантрольныя дыктанты ........ 97

ПЕРАКАЗЫ ........ 99

ПЕРАКЛАДЫ ........ 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 109

Папераджальны дыктант ........ 109
Каменціраваны дыктант ........ 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 110
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 111
Кантрольныя дыктанты ........ 112

ПЕРАКАЗЫ ........ 113

ПЕРАКЛАДЫ ........ 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ ........ 121

Папераджальныя дыктанты ........ 121
Каменціраваныя дыктанты ........ 123
Тлумачальны дыктант ........ 124
Творчыя дыктанты ........ 125
Вольны дыктант ........ 126
Выбарачныя дыктанты ........ 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 129
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 129
Кантрольныя дыктанты ........ 130

ПЕРАКАЗЫ ........ 132

ПЕРАКЛАДЫ ........ 140

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі

ДЫКТАНТЫ ........ 146
Тлумачальны дыктант ........ 146
Вольныя дыктанты ........ 147
Выбарачны дыктант ........ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 150
Кантрольны дыктант ........ 151
ПЕРАКАЗЫ ........ 152
ПЕРАКЛАДЫ ........ 157

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі

ДЫКТАНТЫ ........ 162
Папераджальны дыктант ........ 162
Каменціраваны дыктант ........ 163
Тлумачальны дыктант ........ 164
Вольныя дыктанты ........ 164
Выбарачныя дыктанты ........ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 168
Кантрольныя дыктанты ........ 169
ПЕРАКАЗЫ ........ 171
ПЕРАКЛАДЫ ........ 179

## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ

ДЫКТАНТЫ ........ 192
Папераджальныя дыктанты ........ 192
Каменціраваны дыктант ........ 193
Творчы дыктант ........ 194
Вольны дыктант ........ 195
Выбарачны дыктант ........ 195
Кантрольны дыктант ........ 196
ПЕРАКАЗЫ ........ 197
ПЕРАКЛАДЫ ........ 204
Пераклады-пераказы ........ 206

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ